View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE

УДК 94 (476):[377.1:63]-053.81

# ПРАЎРАДАВЫ МАЛАДЗЁЖНЫ РУХ НА ТЭРЫТОРЫІ БАРАНАВІЦКАГА ПАВЕТА Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

***Віталій Крывуць***
*Баранавічы, Беларусь*

Артыкул прысвечаны развіццю праўрадавага маладзёжнага руху на тэрыторыі Баранавіцкага павета ў 1920 – 1930-х гг. Аналізуецца ўдзел найбольш уплывовых арганізацый і саюзаў моладзі ў рэалізацыі маладзёжнай палітыкі польскіх улад.

***Ключавыя словы: Заходняя Беларусь, Баранавіцкі павет, моладзь, маладзёжны рух, маладзёжная палітыка***

Праўрадавыя маладзёжныя арганізацыі з'яўляюцца важным інструментам афіцыйнай маладзёжнай палітыкі. Гэта ў поўнай меры адносіцца і да міжваеннай польскай дзяржавы, у складзе якой знаходзілася Заходняя Беларусь. Акупацыйныя польскія ўлады стварылі і падтрымлівалі цэлы шэраг "сваіх" маладзёжных саюзаў і аб'яднанняў, пры дапамозе якіх імкнуліся распаўсюдзіць свой уплыў на маладое пакаленне. У якасці прыкладу можна разглядаць развіццё праўрадавага маладзёжнага руху на тэрыторыі Баранавіцкага павета.

Баранавіцкі павет быў створаны на тэрыторыі Брэсцкай акругі Цывільнай управы Ўсходніх зямель у ліпені 1919 г. па распараджэнню Генеральнага камісара Ўсходніх зямель з некалькіх гмін, выдзеленых са Слуцкага і Навагрудскага паветаў [1, с. 180]. З 1921 г. і да верасня 1939 г. ён знаходзіўся ў складзе Навагрудскага ваяводства міжваеннай Польшчы.

Па стану на 1 студзеня 1936 г. Баранавіцкі павет Навагрудскага ваяводства ўключаў 2 гарады – Баранавічы і Ляхавічы, а таксама 12 вясковых гмін – Дарава, Дабрамысль, Гарадзішча, Ястрэмбель, Крывошын, Ляхавічы, Моўчадзь, Мядзведзічы, Новая Мыш, Востраў, Сталовічы, Вольна [2, с. 297]. Па дадзеным перапісу насельніцтва 1931 г. у Баранавічах, самым буйным горадзе тагачаснага Навагрудскага ваяводства, пражывала 22 818 чалавек, агульная ж колькасць насельніцтва павета складала 161 038 чалавек [3, с. 24]. Пры гэтым на тэрыторыі павета пражывала 31 011 чалавек ва ўзросце ад 15 да 24 гадоў [3, с. 34 – 35]. З іх у павятовым цэнтры – 4 873 чалавекі [3, с. 30]. Такім чынам, моладзь складала каля 20% жыхароў павета.

Зразумела, што такая значная і важная частка насельніцтва, як моладзь, не магла заставацца па-за ўвагай кіруючых колаў дзяржавы. У сувязі з гэтым маладое пакаленне Польшчы, у тым ліку і на акупаваных тэрыторыях Заходняй Беларусі, з'яўлялася аб'ектам шырокамаштабнай маладзёжнай палітыкі, якая, асабліва пасля майскага ваеннага перавароту 1926 г., стала неад'емнай часткай унутрыпалітычнай дзейнасці польскіх дзяржаўных структур. На афіцыйным узроўні заяўлялася, што галоўнай задачай гэтай палітыкі з'яўляецца выхаванне годнага грамадзяніна польскай дзяржавы. На самой жа справе кіруючы рэжым імкнуўся перацягнуць маладое пакаленне на свой бок, а на тэрыторыі ўсходніх ускраін мэтай было выхаванне не проста грамадзяніна, а грамадзяніна –паляка ці паланізацыя мясцовага маладога пакалення. Што тычыцца канкрэтных накірункаў працы ў маладзёжным асяроддзі, то асноўнымі з'яўляліся: ваенная і сельскагаспадарчая падрыхтоўка моладзі, грамадзянскае выхаванне, барацьба з маладзёжным беспрацоўем. Ва ўсіх гэтых сферах разам з дзяржаўнымі структурамі – школай, войскам і адміністрацыяй – актыўна працавалі шматлікія праўрадавыя маладзёжныя саюзы і аб'яднанні, філіялы якіх дзейнічалі ў міжваенны перыяд і на тэрыторыі Баранавіцкага павета.

Найбольш вядомай з гэтых арганізацый быў Стралецкі саюз "Стралец". Яго афіцыйнай мэтай з'яўлялася "абуджэнне і загартоўка ў сваіх членах нацыянальнага духу,

Полесгу

дысцыпліны, маральнай і фізічнай актыўнасці, а таксама распаўсюджванне вайсковых ведаў”. Да галоўных накірункаў дзейнасці саюза адносіліся: арганізацыя ваенных заняткаў, збораў, спаборніцтваў і конкурсаў, экскурсій, лагераў і інструктарскіх курсаў [4, с. 18 – 19]. Неабходна адзначыць, што кіраўніцтва “Стральца” надавала значную ўвагу менавіта працы на ўсходніх ускраінах польскай дзяржавы. Лічылася, што “выхаванне ў гэтым рэгіёне па магчымасці большай колькасці грамадзян, гатовых абараняць мяжу ад магчымага нападу суседзяў, з’яўляецца настолькі важнай справай таму, што менавіта ў гэтых раёнах Польшчы насельніцтва з’яўляецца вельмі разнародным і паказвае найменшую зацікаўленасць сваёй будучыняй і разуменне сваіх інтарэсаў” [5, с. 7].

Баранавіцкі абвод “Стральца” ўваходзіў у склад падакругі “Навагрудак” Стралецкага саюза. У саміх Баранавічах стралецкі атрад узнік у пачатку 1922 г. У лютым таго ж года атрад пачаў ваенную падрыхтоўку сваіх членаў пад кіраўніцтвам каменданта падафіцэрскай школы 78-га пяхотнага палка, які размяшчаўся у Баранавічах [6, с. 10]. Першапачаткова ў горадзе дзейнічаў толькі мужчынскі атрад “Стральца”, але ў снежні 1927 г. існаваў і жаночы атрад арганізацыі [7, с. 8].

Атрымала развіццё і сетка стралецкіх арганізацый на тэрыторыі Баранавіцкага павета. Так, вядома, што ў кастрычніку 1927 г. Галоўная камендатура Стралецкага саюза зарэгістравала атрад у Моўчадзі [8, с. 1]. У сакавіку 1928 г. дзейнічалі стралецкія атрады ў Сталовічах, Востраве, Крошыне, Палонцы, Гарадзішчы [9, с. 11]. Своеасаблівым паказчыкам эфектыўнасці развіцця стралецкіх структур на тэрыторыі Баранавіцкага павета было тое, што менавіта ў Баранавічах у снежні 1927 г. быў праведзены першы з’езд падакругі “Навагрудак”. На з’ездзе было абрана кіраўніцтва падакругі, зацверджаны план працы і бюджэт, згодна з якім асноўныя выдаткі павінны былі пайсці на культурна-асветніцкія і спартыўныя мэты [7, с. 8].

У далейшым Баранавіцкі абвод “Стральца” быў адным з вядучых у сваёй падакрузе. Спачатку стральцамі станавіліся, як і ва ўсім Навагрудскім ваяводстве, маладыя чыноўнікі, асаднікі, палякі. Але паступова ў стралецкія атрады была ўцягнута нават частка мясцовай беларускай моладзі. Напрыклад, вядома, што ў маі 1931 г. на тэрыторыі Баранавіцкага павета беларусы складалі да 30% усіх стральцоў і 15% членаў праўленняў атрадаў [10, с. 356].

Акрамя непасрэдна ваеннай падрыхтоўкі, шмат увагі ў баранавіцкім “Стральцы” надавалася спорту. Ужо ў верасні 1924 г. мясцовы атрад накіраваў сваю каманду на акруговыя спартыўныя спаборніцтвы ў Брэсце. Праўда, каманда была нешматлікай, усяго 3 чалавекі. Але баранавіцкі стралец Т. Масакоўскі стаў пераможцам у бегу на дыстанцыі 400 метраў [11, с. 21].

Найбольш значным спартыўным мерапрыемствам, у арганізацыі і правядзенні якога прымаў удзел баранавіцкі абвод Стралецкага саюза, сталі маршавыя спаборніцтвы “Свіцязянскі шлях” па маршруце Баранавічы – Навагрудак. Яго мэтай было ўшанаванне 1-й кадравай роты польскіх легіёнаў і праверка фізічнай спраўнасці войска і арганізацый ваеннай падрыхтоўкі [12, с. 3]. Усяго было праведзена тры такіх марша, у 1927, 1928 і 1930 гг. У іх прынялі ўдзел не толькі стральцы Баранавіч і павета, але і іх калегі з іншых паветаў, а таксама каманды некалькіх палкоў Войска Польскага, Корпуса аховы пагранічча і паліцыі [13, с. 6; 14, с. 28 – 30; 15, с. 2].

Таксама на тэрыторыі Баранавіцкага павета актыўна працавалі гурткі шэрагу праўрадавых саюзаў сельскай моладзі. Першапачаткова яны ўзнікалі пад апекай “дарослага” Акруговага саюза сельскагаспадарчых гурткоў (АССГ) у Баранавічах, які з’яўляўся філіялам створанага ў 1923 г. Саюза сельскагаспадарчых гурткоў Навагрудскай зямлі. Аднак дасягненні АССГ былі даволі сціплымі: у 1927 г. пры ім існавалі толькі 5 гурткоў сельскай моладзі агульнай колькасцю 205 членаў. Галоўным накірункам іх працы была культурна-асветніцкая дзейнасць [16, с. 5]. У далейшым маладзёжныя гурткі атрымалі пэўную незалежнасць і увайшлі ў склад Саюза сельскай моладзі (ССМ) Навагрудскай зямлі.

Полесгу

У 1929 г. маладзёжныя гурткі пачалі ўдзельнічаць у конкурснай акцыі Сельскагаспадарчай падрыхтоўкі (СП). Кіраўніцтва ССМ Навагрудскай зямлі прыняло рашэнне, што ў сельскагаспадарчых конкурсах прымуць удзел, як мінімум, 5 гурткоў у кожным павеце. У Баранавіцкім павеце, дзе на той момант існавала толькі 8 гурткоў ССМ, планавалася правесці конкурсы па вырошчванню бульбы і цукровых буракоў, а таксама конкурсы па адкорму свіней і развядзенню курэй. Перад пачаткам конкурсаў, у студзені – лютым 1929 г., у кожным павеце СВМ арганізаваў для сваіх членаў спецыяльныя курсы, прысвечаныя конкурснай акцыі [17, с. 13]. Неабходна сказаць, што з цягам часу конкурсная тэматыка значна пашырылася і ахоплівала 12 тэм са сферы жывёлагадоўлі і земляробства. Найбольш распаўсюджаным быў конкурс па вырошчванню цукровых буракоў, што, дарэчы, вяло к павелічэнню пасяўных плошчаў гэтай культуры [18, с. 376].

Развіццю акцыі СП перашкаджала раздробленасць праўрадавага руху вясковай моладзі. У пачатку 1930 г. на тэрыторыі Баранавіцкага павета разгарнулася сапраўдная “барацьба за душы” паміж мясцовымі гурткамі ССМ Навагрудскай зямлі і Саюзам народнай моладзі (СНМ). Навагрудскі саюз нават адкрыта запатрабаваў ад СНМ адмовіцца ад працы на тэрыторыі ваяводства, ліквідаваць свае гурткі ці перадаць іх ССМ Навагрудскай зямлі [19, арк. 4]. Але гурткі СНМ у Баранавіцкім павеце захаваліся. Зразумела, што ў атмасферы ўзаемнай барацьбы сельскагаспадарчая асвета адыходзіла на другі план.

Улады даволі паспяхова вырашылі гэтую праблему. У сярэдзіне 1930-х гг. быў узяты курс на ўніфікацыю і стварэнне адзінай праўрадавай арганізацыі вясковай моладзі – Саюза маладой вёскі. 26 мая 1935 г. у Баранавічах адбыўся з’езд мясцовага аддзялення СВМ Навагрудскай зямлі, прысвечаны пытанню ўніфікацыі. Акрамя 60 дэлегатаў на яго былі запрошаны госці з мясцовага філіяла СНМ. Характэрна, што на сходзе прысутнічалі і актыўна ўдзельнічалі прадстаўнікі афіцыйных улад – камандуючы кавалерыйскай брыгадай “Баранавічы” генерал С. Гжмот-Скатніцкі, сенатар К. Рдултоўскі, школьны інспектар Б. Стававы. З’езд ухваліў курс на ўніфікацыю і стварэнне адзінай арганізацыі. Таксама дэлегаты абвясцілі стварэнне павятовага аддзялення Саюза маладой вёскі і абралі яго праўленне. Старшынёй праўлення стаў К. Летоўт (былы кіраўнік мясцовага СВМ), віцэ-старшынёй – К. Гродскі, прадстаўнік СНМ [20, с. 388]. Працэс уніфікацыі зацягнуўся, але ўжо зімой 1936 – 1937 гг. у павеце існавала 45 зарэгістраваных гурткоў СМВ. Сярод іх знаходзіліся і былыя гурткі СНМ з вёсак Вольна, Стайкі, Рачканы, Задвор’е, Патапавічы, Пашкаўцы, Гінцавічы, Смаленнікі, Гарадзішча, Крывошын, Казлякевічы, Гута і інш. [21, с. 158].

Аднак арганізацыйная ўніфікацыя не прывяла да рашучых зрухаў у сферы сельскагаспадарчай асветы маладога пакалення на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства. Колькасць калектываў СП Навагрудскага ваяводства сапраўды павялічылася. У 1936 г. конкурсную працу праводзілі 207 калектываў (1 357 удзельнікаў). Але нават афіцыйныя крыніцы прызнавалі, што гэтага не дастаткова. Па прыблізным падлікам, адзін калектыў СП прыпадаў у сярэднім на 28 вёсак [22, с. 6]. Калі казаць пра ўдзел у акцыі СП гурткоў Саюза маладой вёскі, то ў 1936 г. на іх базе было створана 132 з 207 конкурсных калектываў. Наогул, у Навагрудскім ваяводстве ў сярэднім на 15 чалавек моладзі прыпадаў толькі адзін член СМВ, на 9 вясковых гмін – адзін гурток арганізацыі [23, с. 2].

Што тычыцца непасрэдна Баранавіцкага павета, то ў канцы 1930-х гг. у афіцыйнай прэсе яго называлі “перадавым паветам з пункту гледжання тэмпу працы на вёсцы сельскагаспадарчых і культурна-асветніцкіх арганізацый”. У 1938 г. тут было 44 “дарослых” сельскагаспадарчых гуртка, 27 гурткоў вясковых гаспадынь, 62 гурткі Саюза маладой вёскі і 50 калектываў СП. Гэтыя арганізацыі абслугоўваліся 5 рэгіянальнымі інструктарамі і 7 спецыялістамі па ткацтву, жывёлагадоўлі, сельскагаспадарчай падрыхтоўцы, садаводству, кааперацыі. Асобны інструктар быў і ў СМВ. Але ўсе гэтыя структуры ахоплівалі только 3% ад усяго вясковага насельніцтва павета. Галоўнай прычынай такога становішча называлася цяжкае эканамічнае становішча мясцовай вёскі, у першую чаргу праблема малазямелля. У выніку – бедны селянін са сваім невялікім

надзелам не меў сродкаў на “культурныя” выдаткі, звязаныя з сельскагаспадарчай асветай. Як прызнаваў баранавіцкі карэспандэнт “Кур’ера Віленьскага”, “галодны чалавек пра культуру не думае” [24, с. 5].

Такім чынам, на тэрыторыі Баранавіцкага павета дзейнічай шэраг праўрадавых маладзёжных арганізацый, найбольш актыўнымі з якіх былі “Стралец” і ССМ-СМВ. Яны актыўна ўдзельнічалі ў рэалізацыі афіцыйнай маладзёжнай палітыкі, у першую чаргу ў сферы развіцця спорта і сельскагаспадарчай асветы. Аднак у выніку аб’ектыўных абставін дадзеныя аб’яднанні не здолелі кардынальна змяніць становішча мясцовай моладзі і перацягнуць асноўную яе массу на бок польскіх акупацыйных улад.


1. Rozporządzenie (8015/175) Komisarza Generalnego Ziem Wschodnich o utworzeniu powiatu Baranowickiego jako tymczasowego zarządu gmin wydzialonych czasowo z powiatów Słuckiego i Nowogródzkiego // Dziennik Urzędowy Zarządu Cywilnego Ziem Wschodnich. – 1919. – № 19. – S. 180.
2. Dział informacyjny // Rocznik Ziem Wschodnich i Kalendarz na rok 1937 / pod. red. L. Grodzickiego. – Warszawa, 1936. – S. 292 – 313.
3. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9.XII 1931 r. Meszkania i gospodarstwa domowe. Ludność. Stosunki zawodowe. Województwo Nowogródzkie. – Warszawa, 1938. – 238 s.
4. Wywiał, P. Związek Strzelecki w tworzeniu bezpieczeństwa narodowego Polski. Tradycja i wyzwania XXI wieku / P. Wywiał. – Łódź: Związek Strzelecki, 2009. – 128 s.
5. Gajl, A. Praca Strzelecka na Kresach / A. Gajl // Strzelec. – 1922. – № 4. – S. 7 – 8.
6. Z życia Organizacji. Strzelec w Baranowiczach // Strzelec. – 1922. – № 5. – S. 10 – 11.
7. Pierwszy Okręgowy Zjazd Związku Strzeleckiego w Baranowiczach // Życie Nowogródzkie. – 1927. – № 33. – S. 8.
8. Wykaz oddziałów zatwerdzonych w czasie od 23.X – 29.X.27 r. // Strzelec. – 1927. – № 31. – S. 1.
9. Imieniny Komendanta Piłsudskiego w Baranowiczach // Strzelec. – 1928. – № 14. – S. 10 – 11.
10. Bogalecki, T. Związek Strzelecki wobec słowiańskich mniejszości narodowych w II Rzeczypospolitej / T. Bogalecki // Przegląd Historyczny. – 1995. – № 3 – 4. – S. 351 – 359.
11. Okręgowe zawody sportowo-strzeleckie organizacji P.W. w Brześciu n/B. // Strzelec. – 1924. – № 19 – 20. – S. 19 – 22.
12. Regulamin Marszu Strzeleckiego „Szlakiem Świteziańskim”. – Nowogródek: Drukarnia Wydziału Pow. w Nowogródku, 1930. – 16 s.
13. Kronika // Życie Nowogródzkie. – 1927. – № 13. – S. 6.
14. Drugi Marsz Szlakiem Świteziańskim // Strzelec. – 1928. – № 31 – 32. – S. 28 – 30.
15. III Marsz Szlakiem Świteziańskim // Życie Nowogródzkie. – 1930. – 14 września. – S. 2.
16. Białkowski M. Kółka Rolnicze / M. Białkowski // Życie Nowogródzkie. – 1927. – № 15. – S. 5.
17. Z pracy Związku Młodzieży Wiejskiej Województwa Nowogródzkiego // Życie Nowogródzkie. – 1928. – 24 grudnia. – S. 13.
18. Odlanicki-Poczobutt, S. Województwo Nowogródzkie / S. Odlanicki-Poczobutt. – Wilno: Nakładem Wileńskiej Izby Rolniczej, 1936. – 496 s.
19. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 516.
20. Powiat baranowicki // Siew Młodej Wsi. – 1935.– № 24. – S. 388.
21. Ze wspólnej pracy – jedność młodzieży wiejskiej // Siew Młodej Wsi. – 1937. – № 10. – S. 158.
22. Wieś musi iść również naprzód // Życie Nowogródzkie. – 1937. – 3 stycznia. – S. 6.
23. Co mówią cyfry o pracy społecznej na wsi // Życie Nowogródzkie. – 1937. – 10 stycznia. – S. 2.
24. Bierniakowicz, W. Człowiek głodny o kulturze nie myśli / W. Bierniakowicz // Kurjer Wileński. – 1938. – 24 sierpnia. – S. 5.


ПолесГУ